№ 23 (414)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Аўторак
5
ліпеня
1960 г.

Цана 10 кап.

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

# ПРАЛЯЦЕЛІ ГАДЫ



# ЗАЛАТЫМІ АГНЯМІ...

ПЯЦЬ гадоў назад з розных куткоў Беларусі прыехалі ў Мінск гэтыя дзяўчаты. Паступілі вучыцца ў наш універсітэт. У гарачых дыскусіях аб прачытаных кнігах, у напружанай вучобе, у працы на цалінных землях Казахстана нарадзілася і цэментавалася іх моцная студэнцкая дружба. Ужо на другім курсе Соня Касцюшка, Ала Адамчык, Аня Ніціеўская, Тамара Шпакава, Надзя Валаховіч пасяліліся ў адным пакоі. І з таго часу гэту пяцёрку, здавалася, вадой не разальеш. Разам бачылі іх аднакурснікі ў кіно, у тэатрах, у чытальнай зале. Нават на лекцыях яны садзіліся побач. Гэта ўзаемная сімпатыя не раз выклікала сяброўскія кепікі таварышоў. Здаралася, дзяўчаты заставаліся ўчатырох. Тады яны ведалі, што ім не пазбегнуць каверзнага пытання якога-небудзь аднакурсніка: «А дзе ж ваша пятая?»

Дзяўчаты не сярдавалі на таварышоў за гэты пастаянна паўтараўшыся жарт. Сяброўкі сапраўды за ўсе пяць год амаль не разлучаліся. І справа тут не толькі ў тым, што яны жылі студэнцкай «камунай», не ў тых 150 рублях, якія кожная ўносіла ў агульны «кацёл». Не. Глыбока звязалі дзяўчат узаемныя інтарэсы, таварыская дапамога і выручка, сумесная вучоба— ўсе яны вучыліся на беларускім аддзяленні, любілі беларускую літаратуру і мову, рыхтаваліся стаць уладальнікамі самай пачэснай і высакароднай прафесіі на зямлі—прафесіі настаўніка.



Але вось, непрыкметна праляцела пяць год. Здадзены апошні экзамен. Ані Ніціеўскай крыху пашанцавала. Ёй першай з дружнай пяцеркі ўручылі запаветную кніжачку. І Надзя Валаховіч шчыра павіншавала сяброўку з толькі што атрыманым дыпломам (здымак 1). Якая вялікая радасць!

Закончыліся непазбежна звязаныя з сесіяй хваляванні, не паўторацца больш бяссонныя ночы, у адну з якіх, як сцвярджаюць кампетэнтныя асобы, студэнт можа авалодаць нават кітайскай мовай, праўда, пры ўмове, што здаваць трэба будзе заўтра. І дзяўчаты шчыра радуюцца. Дык чаму ж так летуценна і крыху нават сумна гучыць іх любімая песня (здымак 4):

— Что ж ты нос повесила,
Ведь не скоро сессия,

— Ведаеце, — гаворыць Соня Касцюшка,—сапраўды крыху сумна, шкада развітвацца з універсітэтам. І крыху дзіўна—ніколі больш не трэба будзе баяцца правалаў. Наадварот, напэўна, хутка сама пачну двойкі ставіць.

—Бач ты, якая грозная,—смяецца Надзя Валаховіч,—а шпаргалкі адбіраць будзеш?

— Абавязкова. Ніколі і нікому не дам спісваць.

— Нават на экзаменах?! — з робленым жахам успляснула рукамі Надзя.

— Ну... на экзаменах...—Соня яўна азадачана.

А дзяўчаты з'едліва смяюцца.





Потым задумваюцца. Жарты жартамі, а работа крыху і палохае іх. Якія яны будуць—іх вучні — здольныя, лянівыя, паслухмяныя, ці сарві-галовы і вісусы. Напэўна, будуць і тыя, і іншыя. І да кожнага патрэбна будзе знайсці асобны падыход, з кожнага настаўнік, а гэта значыць і яны, павінны зрабіць чалавека, нашага савецкага чалавека, будаўніка камунізма. Якія духоўныя сілы патрэбны для гэтага! Гэта ж тым самым сарвігаловам, якія, напэўна, трапяцца ў іх класе, і прадстаіць завяршыць будаўніцтва самай светлай мары чалавецтва — камунізма. Але... Дзяўчаты прызнаюцца, што без свавольнікаў работа здаецца ім не такой прывабнай.

Сяброўкі адразу робяцца сур'ёзнымі і цягнуцца да карты (здымак 3). Хочацца і паглядзець, як далёка параскідаў іх лёс, і ўявіць, як яна складзецца—іх будучая работа. Соня Касцюшка едзе ў Шчучынскі раён, Ала Адамчык — у Слонімскі, Аня Ніціеўская — ў Барысаўскі. У распараджэнне раённых аддзелаў народнай асветы, накіраваны і Надзя Валаховіч, і Тамара Шпакава. Верагодней за ўсё, што дзяўчаты будуць выкладаць у сельскіх школах. Што ж, гэта безумоўна больш складана, але цяжкасці не палохаюць сяброўак. Нездарма ж на размеркаванні на традыцыйнае пытанне, дзе б вы жадалі працаваць, кожная не задумваючыся адказала: «Куды пашле камісія».

Ну а пакуль былыя камунаркі дамаўляюцца, як ім звязацца адна з другой, абменьваюцца адрасамі (здымак 2). Кожнай цікава, як будзе жыць і працаваць сяброўка.

Апошнія часы, апошнія хвіліны. Развіталіся дзяўчаты з універсітэтам, з найбольш любімымі мясцінамі сталіцы Беларусі. Спакаваны ў чамаданы небагаты студэнцкі скарб, атрыманы пад'ёмныя. У вялікае жыццё выходзяць сяброўкі. Але студэнцкая дружба ніколі не згасне. І куды б не закінуў лёс дзяўчат, яны ніколі не забудуць, сваю «камуну», універсітэт, дзе насычаная радасцю пазнання залатымі агнямі праляцелі гады вучобы.

**А. БАЛАШ.**

# НАШ ВЫПУСК

*Іх 613 чалавек. Калісьці прага да ведаў прывяла гэтых юнакоў і дзяўчат у сцены нашага універсітэта з розных гарадоў і вёсак. Пяць год на лекцыях і семінарах, на практыцы, на лабараторных занятках, бралі яны ад навукі ўсё, што толькі магла даць старэйшая ВНУ Беларусі.*

*І вось першага ліпеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ўрачыста былі ўручаны дыпломы выпускнікам фізічнага факультэта. Яны атрымалі іх апошнімі. Раней фізікаў цёмнаблакітныя кніжачкі атрымалі матэматыкі і літаратары, хімікі і юрысты, біёлагі і гісторыкі, географы і журналісты. Працаваць яны будуць у сярэдніх школах, на заводах і фабрыках, у савецкіх, партыйных і гаспадарчых органах. 15 тысяч спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры, падрыхтаваў універсітэт за гады свайго існавання. У гэту армію ўлілося выдатнае папаўненне.*

*Добры настрой сёння ў юрыста, удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны Ніны Аляксандраўны Пашковай, у былых воінаў матэматыка Уладзіміра Далідовіча, хіміка Міхаіла Батаева.*

*— Вельмі хочацца працаваць,— гаворыць Уладзімір Далідовіч,— хочацца аддзякаваць дзяржаве за ўсе клопаты аб нас.*

*Ад Камчаткі і Сахаліна да Калінінградскай вобласці раз'язджаюцца выпускнікі. Журналіст П. Казачонак едзе ў Калінінград, а яго аднакурснік А. Станюта — ў Архангельск, гісторыкі Юры Афонін і Марыя Капціловіч будуць працаваць у школах Паўднёва-Уральскай і Паўночна-Заходняй чыгунак, географ Тамара Святагорава стане членам геалагічнай экспедыцыі на Далёкім Усходзе, хімікі Рамуальд Гронскі і Мікалай Навіцкі будуць працаваць інжынерамі ў Чэлябінску, юрыст Аляксандр Астапчык абраў месцам сваёй працы востраў Сахалін, а Леанід Крамень—Магаданскую вобласць, Раіса Слуцкер—Камчатку.*

*Хочацца пажадаць нашым выпускнікам заўсёды быць на перадавых пазіцыях будаўніцтва камунізма, не старэць душой, назаўсёды захаваць студэнцкі запал і прагу да жыцця, да працы.*

**Л. КЛЯУС.**

## У АПОШНІЯ МІНУТЫ



Калі ты знаходзішся ва універсітэце апошнія мінуты, нядрэнна сфатаграфавацца на памяць разам з сябрамі. Гэта і зрабіла група выпускнікоў фізічнага факультэта. Фота А. БАЛАША.

# У ДОБРЫ ЧАС, ШЧАСЛІВАЙ ВАМ ДАРОГІ, СЯБРЫ!

У АПОШНІЯ МІНУТЫ



Калі ты толькі што атрымаў універсітэцкі значок, цяжка ўтрымацца, каб не прывінціць яго да лацкана пінжака. Прыемны абавязак узяла на сябе Валя Крукоўская. Яна дапамагае Любе Кураўковай набыць зусім самастойны выгляд чалавека з вышэйшай адукацыяй.

Фота А. БАЛАША.

# Клічуць дарогі

*Вось і закончана гарачая пара. Зданы экзамены, на сэрцы лёгка і спакойна...*

*— Што вы думаеце рабіць летам?—з такім пытаннем мы звярнуліся да жыхароў пакою 63 інтэрната па вуліцы Свярдлова.*

*Тут жывуць сябры-аднакурснікі аддзялення журналістыкі: два Толі—Кудравец і Шрубок і Міша Шыманскі. Яны толькі што сталі трэцякурснікамі. Цяпер хлопцы збіраюцца ў дарогу.*

*— Я буду працаваць у калгасе,—першым падзяліўся сваімі планамі Шыманскі.—Вельмі карысна для здароўя памахаць касою ўранку, папрацаваць на ўборцы. А то, між намі кажучы, кніжкі даволі надакучылі...*

*Глядзіш на Мішу і міжволі думаецца, што гэтаму дужаму хлапчыне любая праца пад сілу.*

*Між тым Міша працягвае:*

*— І яшчэ. Вы ж ведаеце, што ў маім раёне будуецца Бярозаўская ДРЭС. Буду пісаць пра яе будаўнікоў. І наогул думаю стаць актыўным селькорам раённай газеты.*

*— Ну, а вы, Толя?*

*Невысокі, плячысты хлапец ахвотна расказвае:*

*— Збіраюся стаць падарожнікам, думаю пахадзіць па роднай Магілёўшчыне, паглядзець, як жывуць і працуюць землякі. Пра цікавыя сустрэчы, пра цудоўных людзей буду пісаць у газеты.*

*Такія планы ў Кудраўца. А трэці з сяброў—Толя Шрубок — мінчанін. Ён будзе працаваць у газеце «Советская Белоруссия».*

*— Буду імкнуцца выконваць любыя заданні. Хачу паспрабаваць пісаць у розных жанрах... Хачу ўдасканальвацца таксама ў фотарэпартажы: люблю гэтую справу!*

*Хочацца пажадаць сябрам-журналістам прыемна і карысна адпачыць і паспяхова выканаць усе намечаныя планы.*

І. ПАТАПАЎ.

У АПОШНІЯ МІНУТЫ



... Цікава яшчэ раз разам з сяброўкай прагледзець свой альбом.

Фота І. ПАЎЛІКОЎСКАГА.

З АПОШНІХ ЭКЗАМЕНАЎ

# Нядрэнны вынік

17 выдатных адзнак, 40 добрых, 22 здавальняючых і адна нездавальняючая—вось такі вынік экзаменаў па хіміі на першым курсе хімічнага факультэта. Калі ўлічыць, што патрабаванні, якія прад'яўляюцца да студэнтаў з кожным годам узрастаюць, дык гэты вынік нельга лічыць дрэнным. Ён азначае, што большасць студэнтаў сур'ёзна працавала на працягу ўсяго вучэбнага года, што больш 20 з іх не толькі засвоілі праграмны матэрыял, але і глыбока разабраліся ў ім.

Раней мне здавалася, што студэнты з вытворчым стажам, якія паступілі па-за конкурсам, будуць займацца значна горш, чым тыя, хто прайшоў скрозь фільтр вялікага конкурсу. Але, праслухаўшы адказы першакурснікаў у гэтым і мінулым годзе, я зразумеў, што памыляўся. Адказы студэнтаў, што прыйшлі з вытворчасці, камуністаў Адамовіча, Патапенкі былі такімі ж глыбокімі і змястоўнымі, як і адказы студэнтаў Кустовай, Галяшэвіча, Паповай і іншых, што прышлі са школьнай парты. Вельмі прыемна, што на курсе аказалася мала такіх студэнтаў, як Жарабцова і Станішэўская, якія ледзь здалі экзамены.

* *

У мяне склалася ўражанне, што вялікая доля віны ў дрэннай падрыхтоўцы гэтых студэнтаў ляжыць і на настаўніках сярэдніх школ, дзе яны навучаліся. У многіх школах не прывучылі вучняў разважаць, і яны проста завучваюць змест падручніка. Нашым выпускнікам трэба будзе ўлічыць гэту акалічнасць у сваёй будучай рабоце.

В. СВІРЫДАЎ, дацэнт.

Творчасць завочнікаў

# Я веру!

Я ў дзяцінстве не ведаў
дзяцінства —
Яго адабрала вайна.
У час бамбёжак,
Шрапнельнага свісту
Быў я рады табе, цішыня!
Але рэдка змаўкала наўкола,
Дзень пры дні гула кананада
І замест слова—
«школа»
Я дазнаўся аб слове—
«блакада».
Цішыня! Я люблю гэтае слова!
Але толькі не ціха ў свеце.
Веру я:
ўсё ж дзяцінства такога,
Як маё,
Не пазнаюць дзеці!

М. КАЦЮШЫН, студэнт-завочнік аддз. журналістыкі.

# НОВАЕ НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

У сувязі з Законам аб перабудове народнай адукацыі ў СССР значныя змены адбыліся ў апошнія гады на завочным факультэце нашага універсітэта. Для таго, каб ліквідаваць разрыў паміж стацыянарнай і завочнай адукацыяй, цяпер зацверджаны адзіныя вучэбныя планы. У вучэбных планах завочнага факультэта значна павялічана колькасць гадзін на лабараторныя і практычныя заняткі, уведзены новыя спецкурсы аб апошніх дасягненнях айчыннай і замежнай навукі, больш увагі ўдзяляецца тым прадметам, якія звязаны з жыццём, з практыкай камуністычнага будаўніцтва. У сувязі з перабудовай вучэбнага плана некаторыя дысцыпліны скарочаны або зусім ліквідаваны. На іх месца ўведзены іншыя. Так, напрыклад, на геаграфічным аддзяленні ўведзены такія новыя дысцыпліны, як фізіка, хімія, матэматыка. На гэтым жа аддзяленні скарацілі колькасць гадзін па геаграфіі транспарту, геаграфіі прамысловасці і павялічылі па эканамічнай геаграфіі СССР. На біялагічным аддзяленні ўведзена псіхалогія і хімія палімераў.

На аддзяленні журналістыкі таксама ўведзены новыя прадметы: асновы савецкага права, стылістыка, гісторыя мастацтва.

Для таго, каб студэнты-завочнікі былі больш звязаны з вытворчасцю, на старэйшых курсах уведзена вытворчая практыка для студэнтаў, якія працуюць не па сваёй спецыяльнасці. На біялагічным аддзяленні студэнты праходзяць практыку ў калгасах і саўгасах рэспублікі; на гістарычным—у архівах, на аддзяленні журналістыкі—у раённых і абласных рэдакцыях. У час экзаменацыйнай сесіі арганізуюцца экскурсіі на прадпрыемствы Мінска. Акрамя таго, для студэнтаў—завочнікаў штодзённа дэманструюцца вучэбныя кінафільмы. Значная палёгка студэнтам наступіць з новага вучэбнага года ў сувязі з зацвярджэннем кансультацыйных пунктаў у нашай рэспубліцы. Рад прадметаў можна будзе здаваць да сесіі на кансультацыйных пунктах.

Дзякуючы зменам, якія адбыліся ў жыцці універсітэта, паспяхова завочнікаў значна павысілася. Гэта асабліва добра відаць з дыпломных работ. У сваёй большасці тэмы дыпломных работ студэнтаў-завочнікаў надзённыя, набліжаны да жыцця, да вытворчасці. Многія дыпломныя работы будаваліся на мясцовым матэрыяле. Так, студэнты-гісторыкі даследуюць барацьбу партыйных арганізацый розных раёнаў Беларусі за ўздым сельскай гаспадаркі. Студэнты-біёлагі свае работы прысвячаюць пытанням уздзення гаспадаркі калгасаў і саўгасаў рэспублікі.

П. НІКАЛАЙЧУК.



Гэта—Валеры Гракаў, выпускнік фізфака. На факультэце яго ведалі як выдатніка вучобы, здольнага даследчыка і камсамольскага актывіста

Фота А. БАЛАША.

# Вячэрнікі...

Юры Занеўскі—студэнт вячэрняга аддзялення юрыдычнага факультэта, слесар трактарнага завода.

Дома аказаліся Юры і яго жонка, студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта, якая хутка павінна стаць маці. Значыцца клопатаў павялічыцца, але гэта не палохае маладажонаў. Яны ўмеюць змагацца з цяжкасцямі.

Юры спяшаўся на кансультацыю. Апранаючыся, ён расказаў, што працаваць сапраўды даводзіцца многа, з завода не заўсёды паспяваеш забегчы да хаты.

Потым мы разам беглі ва універсітэт пад буйным ліўнем, пераскокваючы праз лужыны. Юрый расказваў: «У мяне мала цікавага, працую як і ўсе. Вось Жэня Лісічкін. Ён працуе аператыўным упаўнаважаным крымінальнага вышуку ў Кастрычніцкім раёне. Кожны дзень прыносіць яму столькі цікавага, новага, нечаканага і часам цяжкага. Я калі-ні-калі дапамагаю яму і адначасова сам вучуся. За плячыма Яўгенія багаты жыццёвы вопыт. Бортрадыст авіяцыі ў мінулым, а потым навучэнец школы міліцыі. Я абавязкова пазнаёмлю вас з ім».

Добра, калі чалавек любіць сваю прафесію. З запалам будзе працаваць.

— У нас многа добрых рабят—працягвае Юры,—Касцюкевіч, Кудраўцаў, Сіманкоў, Гаравы і іншыя. Вось Анатоль Суднікоўскі, мантажнік аднаго з мінскіх заводаў, афіцэр запасу, які аб'ездзіў амаль усю краіну і добра ведае жыццё. Яго часта можна сустрэць у бібліятэцы. Ці напрыклад, Маша Бурэнкава, паважаная ўсімі на курсе, лепшая ткачыха камвольнага камбіната, актыўная і вясёлая дзяўчына; брыгадзір слесарнай брыгады Жук, былы марак, настойлівы і сур'ёзны. Праўда, ёсць непаспяваючыя, але гэта часова, вось пабачыце самі,—яго голас гучэў спакойна, упэўнена.

Я. САКОВІЧ, студэнтка вячэрняга аддзялення журналістыкі.

У АПОШНІЯ МІНУТЫ



...Хочацца пажартаваць з сябрамі, з якімі ты правучыўся пяць год.

Фота М. БАНДАРЭНКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 06972. Зак. 1217. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000.